ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 26 (299) 19 — 26 ліпеня 2003 г.

ПО ПОВОДУ

СЛЕДУЮЩИЙ, – СКАЗАЛ ЗАВЕДУЮЩИЙ

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Странную неуверенность обнаруживает в себе и своих правительствующих товарищах Александр Лукашенко накануне судьбоносного заявления о продлении собственных полномочий. Безо всякой на то политической надобности он стал *«перетрахивать»* правящую верхушку.

Опираясь на бюрократический аппарат, вроде бы ничто не мешает главе белорусского государства добиться всенародного одобрения конституционных поправок, позволяющих ему избираться сверх всякой меры и сроков. Ведь услужливые чиновники нарисуют в протоколах избирательных комиссий любые, сколь угодно невероятные цифры абсолютной любви белорусского народа к своему бессменному правителю. Так уже было и в 1996 году, и в 2001.

Появилось даже руководящее *чиновное* мнение, что можно *вообще обойтись и без всенародного* волеизъявления. Палатные депутаты могут потрафить любимому президенту без изменения конституции, приняв одноразовый конституционный акт. И все для того, чтобы начальник всех наших властей спокойно пошел на новый срок.

Однако Александр Лукашенко, находясь во власти какого-то астенического синдрома, бросился демонстрировать стране и миру вульгарный популизм. Мотайте на ус: царь-де на Беларуси хороший, а бояре плохие. Поскольку злоумышленно задерживают выплату колхозного жалованья и не рассчитываются в срок за сданное государству молоко от личных коров обездоленных колхозников.

Популярности белорусскому государю это нисколько не прибавит. В президентской вертикали чиновники обижены его черной неблагодарностью в награду за усердную службу. Также едва ли неслыханно возрастет президентский рейтинг в широких избирательских массах, где почти две трети электората так или иначе не довольны правлением лично Александра Лукашенко, а не обновляющимся каждые два года кабинетом министров.



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Марионетка», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-КУКОЛЬНИК

Популистские разбирательства президента Лукашенко с правительством едва ли поднимут благосостояние пресловутых сельских жителей, о которых он так печется. Задержки зарплаты и выдачи в колхозные руки прочего денежного довольствия никуда не денутся. Напротив, по белорусским весям широко распространяется практика, когда мизерное жалованье колхозников целиком перечисляется на счета райпотребсоюзов, монопольно владеющих всей торговлей в сельской местности. Все больше и больше крестьян теперь вынуждены отоваривать свою мизерную зарплату исключительно в деревенских лавках по спекулятивным райпотребсоюзным ценам.

С точки зрения предвыборного популизма, кадровая забота Александра Лукашенко о сельских тружениках вообще лишена практического смысла. Все-таки в деревне живет меньшинство избирателей, ему оно и без того в целом доверяет, какие бы политэкономические безобразия ни совершались его ставленниками в агропромышленной сфере.

Если в прошлом году сельское хозяйство оказалось в зоне особого внимания президента Лукашенко в силу внешнего фактора, то вряд ли сейчас аграрный вопрос столь насущен, несмотря на подмокающий урожай. Тогда была явная конъюнктурная необходимость ответить *«продовольственной безопасностью»* президенту Путину, предложившему *«отделить мух от котлет»* в белорусско-российских взаимоотношениях.

Хотя внешние и внутренние векторы белорусской политики взаимосвязаны, все же не имеет смысла считать кадровые перестановки в правительстве ответом на антилукашенковскую резолюцию ПА ОБСЕ.

Совсем другой расклад мы получаем, если за внешней твердостью Александра Лукашенко, перелицовывающего свое правительство, скрывается внутренняя нерешительность. Очевидно, он еще не окончательно убедился в том, что сейчас подходящее время, чтобы объявить себя президентом-сверхсрочником.

Из-за неуверенности в себе Александр Лукашенко вернулся к основам своей кадровой политики, сформулированным им еще весной 1994 года. В бытность кандидатом в президенты на вопрос, кого он намерен назначить премьером, будущий белорусский президент неизменно отвечал, что *«это только доярку в колхоз трудно найти»*, а подходящих претендентов на премьерскую должность у него в избытке.

Как всегда, Александр Лукашенко лукавил. Некого ему было объявлять потенциальным председателем правительства. В ту предвыборную пору он отнюдь не был убежден в своей безоговорочной победе на президентских выборах и особенно в том, что сможет утвердиться во власти. Поэтому шел мучительный поиск кандидатуры, годной на роль политического, а не технического премьер-министра.

Окончание на стр. 2 ➲

СУСТРЭЧЫ Ў РЭДАКЦЫІ

«Я спакойна мог глядзець любому ў вочы»

На пытанні журналістаў «Згоды» аб сённяшняй сітуацыі ў грамадстве адказвае пісьменнік Сяргей Законнікаў.

— Сяргей Іванавіч, у савецкія часы вы займалі адказную пасаду ў ЦК КПБ – загадчык сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры. Ці ёсць падабенства таго часу і сённяшняга?

— Такой жорсткай рэгламентацыі і падпарадкавання ўсяго нашага грамадскага і гаспадарчага жыцця «вертыкалі», як у нас зараз, не было нават тады. Гэта я кажу як чалавек, які назіраў тую сістэму знутры. Людзі і ў апараце ЦК, і на месцах у абласцях, раёнах і гарадах, адчувалі сябе адказнымі за свой участак працы. А не так, як сёння. Усё вырашае адзін чалавек. У такой сітуацыі ніякага парадку ў дзяржаве быць не можа. Таму што людзі, якія толькі глядзяць яму ў рот, не могуць забяспечыць нармальную работу любой галіны.

З самага пачатку ішоў на гэтую пасаду цяжка. Адмаўляўся, бо і сёння лічу: калі Бог даў нейкія здольнасці, то трэба іх выкарыстоўваць па прызначэнні. Любая чыноўніцкая работа, любая служба паглынае не толькі многа часу, але і тваю душу. Таму што душы нельга быць раскіданай. Але мяне ўгаварылі сябры. Сказалі: «Ідзі, бо калі прыдзе другі, будзе горш».

Браў мяне на працу Пётр Міронавіч Машэраў. Тады такая завядзёнка ў ЦК была, што новых інструктараў, загадчыкаў сектараў прымаў на працу сам першы сакратар. І адразу ж ён у мяне спытаў: «Ці з жаданнем вы ідзеце сюды працаваць?». Я шчыра прызнаўся: «Не». Ён пацікавіўся: «Чаму?» «Таму, – сказаў я, – што хачу займацца творчай работай. Мяне ўгаварылі.» Тады Машэраў запытаўся: «А ведаеце вы, чым павінны займацца?». Я кажу: «Ну, відаць, трэба спрыяць літаратурна-мастацкаму працэсу, дапамагаць пісьменнікам выдаваць кніжкі, вырашаць іх праблемы». І Машэраў сказаў: «Малайчына! Я згодны з такой пазіцыяй. Будзем працаваць!»

Заканчэнне на стар. 3 ➲

ОЧЕРКИ ЖИЗНИ

ЛИЦА БЕЛОРУССКОЙ РЕКЛАМЫ

ЮЛИЯ ДРАНЧУК

Кто они? Чувствуют ли себя известными, когда наблюдают свое собственное изображение на телеэкране по 30 раз на дню? Мы встретились с некоторыми из них и попытались выяснить: как им живется после того, как их лицо стало физиономией из рекламы?

ДЕНЬГИ – НЕ ГЛАВНОЕ

Симпатичный бармен Арсен из клуба «Алькатраз» уже успел забыть то время, когда снимался в рекламном ролике растительного масла «Алея». Выбрали его случайно:

– Я тогда работал в ресторане *«Крыніца»*. И когда помощница режиссера договаривалась об аренде ресторана для съемок, спросила, кто умеет жонглировать бутылками. Я тогда этим увлекался, да и мой типаж внешности им подходил, и она предложила сняться в ролике. Гонорар сразу оговаривался – по-моему, 20 у.е. мне за это предложили. Я согласился, и дело было не в деньгах. Я бы и бесплатно не отказался сниматься на тот момент – было ново и интересно. Ролик был 15-секундный, снимали на кинопленку, работа заняла часов 6-7.

Я остался доволен. Сам процесс съемки страшно завораживает. Это некое действо. Изменилась ли моя жизнь? Да нет. На улицах узнавать не стали. Конечно, знакомые звонили: мол, видели тебя по телеку. Родители были горды и довольны. Я тогда уже не жил с ними, и они были рады видеть меня каждый день по нескольку раз по ящику, пусть себе в одной и той же роли. А сейчас если бы предложили сняться... скорее всего, отказался бы. И дело опять-таки не в деньгах. Просто времени нет. А ради попробовать – уже пробовал.

Что размер гонорара не имеет значения – подтверждает и Дмитрий, главное действующее лицо рекламного ролика питьевой воды «Фрост»:

– Понимаете, для меня в этих съемках деньги не являлись очень важными, поскольку я же не этим на жизнь зарабатываю. Это опыт – неоценимый, его нигде не купишь. За работу получил, кажется, баксов 50. Но цифра – это не главное. Мои дивиденды исчислялись не деньгами.

Окончание на стр. 6 ➲

АНЕКДОТ-С

– Как теперь российское телевидение намеревается показывать белорусского президента?

– До принятия конституционного акта в передаче «В мире животных», а после – в программе «Очевидное – невероятное».

***

– За что был уволен премьер Новицкий?

– Лукавый попутал.

***

– Какой самый дорогой белорусский деликатес?

– Мозги отставных чиновников президентской вертикали. Представляете, сколько их надо забить, чтобы получить хотя бы один килограмм замороженного полуфабриката! А чтобы накормить всех колхозников...

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



«Горожане, смирно. Равнение на поле!»

(А. Сюльжина, «ОНТ», 17.07.03)



«Но человек не способен учиться на чужих ошибках»

(А. Федута, «Товарищ», 17.07.03)



«Зримым показателем социального благополучия, стабильного экономического развития общества является здоровье наших людей»

(П. Игнатьев, «Рэспубліка», 17.07.03)

НАВІНЫ

ЗЬНІКЛЫЯ. Пасьля паўгадовага перапынку зноў аднаўленае расьследаваньне справы Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага, якія былі выкрадзеныя невядомымі 16 верасьня 1999 году. Рашэньне аднавіць расьследаваньне прыняў пракурор Менску Мікалай Кулік. Таксама ён вырашыў замяніць сьледчага: далей весьці справу будзе сьледчы асабліва важных справаў гарадзкой пракуратуры Сяргей Кухаронак. Гэта ўжо трэці сьледчы: раней справу расьсьледавалі Сяргей Новікаў і Ўладзімер Чумачэнка. У гарадзкой пракуратуры не патлумачылі, якія новыя абставіны паўплывалі на рашэньне аднавіць расьследаваньне справы Ганчара і Красоўскага. Абаронца сваякоў зьніклых Гары Паганяйла паведаміў, што ўзнаўленьне расьследаваньня ніяк не паўплывала на рашэньне сваякоў зьніклых і абароны зьвярнуцца з іскам на ўлады Беларусі ў адзін з эўрапейскіх судоў.

АКЦЫЯ. У ноч з 14 па 15 ліпеня прадстаўнікі маладзёвага руху «Зубр» вывесілі ў Менску бел-чырвона-белыя сьцягі. Так моладзь адзначыла гадавіну перамогі беларуска-літоўскага войска над крыжакамі пад Грунвальдам 15 ліпеня 1410 году. Сьцягі былі вывешаныя ў цэнтры гораду і ў спальных раёнах сталіцы – Малінаўцы і Паўднёвым Захадзе на высакавольтных лініях. Самы вялікі сьцяг рэяў на галоўным праспэкце Францішка Скарыны – насупраць будынку КДБ.

ПЛАН. Пяць партыяў – БНФ, Аб'яднаная грамадзянская партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, Партыя камуністаў Беларуская і Партыя працы – пачалі выпрацоўку супольнага плану па недапушчэньні ўсталяваньня ў Беларусі пажыцьцёвага кіраваньня «беларусьбашы». Апазыцыйныя лідары адзначылі, што сёньня больш як 65 адсоткаў грамадзянаў Беларусі выступаюць супраць трэцяга тэрміну прэзыдэнцтва. Разам з тым кіраўніцтва краіны недвухсэнсоўна выказвае жаданьне зьмяніць артыкул канстытуцыі, які дазваляе ня больш як два тэрміны прэзыдэнцтва для аднаго чалавека, у тым ліку, магчыма, праз рэфэрэндум. Але ніякія рэфэрэндумы й выбары пры захаваньні цяперашняга антыдэмакратычнага выбарчага заканадаўства й агульнай рэпрэсіўнай атмасфэры ў краіне ня могуць выявіць сапраўдную волю народу. Таму партыі мусяць аб'ядноўваць намаганьні, каб не дапусьціць увядзеньня трэцяга тэрміну прэзыдэнцтва. Як заявіў старшыня АГП Анатоль Лябедзька, першае чытаньне і абмеркаваньне плану адпору такім захадам адбудзецца ўжо на наступным тыдні.

СМІ. Маскоўская *«Новая газета»* надрукавала адмысловы выпуск для Беларусі з матэрыяламі *«БДГ»*. Надрукаваныя, напрыклад, інтэрвію Васіля Быкава, якое раней не публікавалася, і распoвед пра тое, што цяпер робіцца ў калгасе «Рассвет» – праз 5 гадоў пасьля прысуду Васілю Старавойтаву. Галоўная рэдактарка *«Белорусской деловой газеты»* Сьвятлана Калінкіна паведаміла, што і іншыя газэты Расеі таксама гатовыя друкаваць прыпыненае ў Беларусі выданьне. Можа быць зарэгістраванае і расейскае выданьне з назвай *«БДГ»*. Спадарыня Калінкіна зазначыла, што цяпер усе прэтэнзіі, якія могуць зьявіцца ва ўладаў, мусяць быць адрасаваныя *«Новой газете»*. Паводле словаў рэдактаркі, яна нават ня ведае, які наклад мае беларускі выпуск гэтага выданьня. Плянуецца, што беларускія спэцвыпускі будуць друкавацца ў Маскве раз на тыдзень.

УКАЗ. Паводле апублікаванага 15 ліпеня ўказу Аляксандра Лукашэнкі, амаль шэсьць дзясяткаў дзяржаўных міністэрстваў, камітэтаў і шэрагу ведамстваў надзеленыя паўнамоцтвамі лічыць зьвесткі аб сваёй дзейнасьці дзяржаўнай таямніцай. Звыклае кола носьбітаў сакрэтнай інфармацыі, якое калісь традыцыйна складалі КГБ, міністэрствы абароны і ўнутраных справаў, шматкроць пашырылася. Ніколі яшчэ ў пераліку дзяржаўных арганізацыяў, дзейнасьць якіх адносіцца да сакрэтнай, не былі аднесеныя ўстановы кшталту міністэрстваў адукацыі, культуры, спорту; саюзы спажывецкіх таварыстваў, абласныя і гарадзкія выканкамы, упраўленьне чыгункі і г.д. Пачынаецца сьпіс засакрэчаных аб'ектаў з прэзыдэнцкай адміністрацыі, а перадапошні ў вялізным пераліку – Цэнтар бясьпекі інфармацыі пры прэзыдэнце РБ. На постсавецкай прасторы падобны ўказ дзейнічае толькі ў Туркменістане: там пад пагрозай сьмяротнага пакараньня забараняецца распаўсюджваць інфармацыю, якая можа патрапіць за межы краіны і стварыць пагрозу нацыянальнай бясьпецы. У большыні іншых краінаў эпіцэнтрамі дзяржаўнай засакрэчанасьці застаюцца службы зьнешняй і ўнутранай выведкі, вайсковыя ведамствы, падразьдзяленьні антытэрарыстычнай скіраванасьці. Пакуль не агучана, якое пакараньне чакае супрацоўнікаў ведамстваў за разгалошваньне дзяржаўных сакрэтаў: ёсьць зьвесткі, што будуць унесеныя адпаведныя папраўкі ў Крымінальны кодэкс. Варта нагадаць, што ў савецкі час распаўсюд засакрэчанай інфармацыі лічыўся адным з найбольш цяжкіх злачынстваў.

ДЭКРЭТ. Паводле дэкрэту № 17, з падпісаньнем якога Лукашэнка цягнуў два гады, са 165 да 49 скарачаецца колькасьць відаў дзейнасьці, якія падпадаюць пад ліцэнзаваньне. Незалежна ад віду дзейнасьці, за ліцэнзію трэба плаціць 90 эўра. Ліцэнзіі пачнуць выдавацца з 1 лістапада на тэрмін ня менш за 5 і ня болей за 10 гадоў. Ліцэнзіі, выдадзеныя да пачатку дзеяньня дакумэнта, будуць дзейнічаць да 1 траўня 2004 году. Пасьля бізнэсоўцы мусяць заплаціць па 90 эўра за новыя ліцэнзіі, нават калі старыя выдаваліся яшчэ на колькі гадоў наперад.

АРЫШТ. Намесьнік генэральнага дырэктара Менскага трактарнага заводу Іван Літошка арыштаваны па абвінавачаньні ў пастаўках 400 трактароў без палярэдняй аплаты праз падстаўную фірму. Іван Літошка працаваў на пасадзе намесьніка гендырэктара каля году. Да суду яго будуць трымаць у сьледчым ізалятары. Калі будзе даказана, што арыштаваны вінаваты ў крадзяжы дзяржаўнай маёмасьці, яму пагражае пазбаўленьне волі тэрмінам да 10 гадоў.

АДУКАЦЫЯ

Ліцэісты рыхтуюцца

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Бацькі навучэнцаў менскага Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа заявілі, што іх дзеці з 1 верасьня ні ў якую іншую навучальную ўстанову і ні да якіх іншых настаўнікаў ня пойдуць. Усю адказнасьць за вучнёўскі байкот ўскладаецца на дзяржаўных чыноўнікаў.

Аб такім выключным рашэньні ўжо паведамлена выканаўцу абавязкаў прэм'ер-міністра Сяргею Сідорскаму, міністру адукацыі Пятру Брыгадзіну і старшыні камітэту па адукацыі Менгарвыканкаму Міхаілу Ціцянкову. У лісце, які падпісалі 97 бацькоў, вылучаецца патрабаваньне адмяніць пастанову Рады міністраў ад 25 чэрвеня аб скасаваньні ліцэю, захаваць яго беларускамоўны статус з унікальнымі навучальнымі праграмамі і зладжаны калектыў вучняў і педагогаў.

Вышэй згаданая пастанова, адзначаецца ў заяве, парушае дзеючае заканадаўства аб правах бацькоў і дзяцей выбіраць мову навучання і навучальную ўстанову. *«Ліквідацыю ліцэя мы расцэньваем як дыскрымінацыю па моўнай і нацыянальнай прыкметах»*, – заяўлена ў звароце.

Колькі часу таму чыноўнікі, сярод іх і Брыгадзін зь Ціцянковым, неаднаразова абяцалі і настаўнікам, і бацькам, што 1 верасьня дзеці будуць вучыцца на беларускай мове ў тых жа настаўнікаў і ў ранейшым будынку. *«Няўжо чыноўнікі, што займаюць такія адказныя пасады, здольныя хлусіць, глядзячы ў вочы дзецям, іхным бацькам і настаўнікам ліцэя?»* – пытаюцца ў лісце бацькі.

Яны абвесьцілі, што з новага навучальнага году аддадуць сваіх дзяцей толькі ў родны ліцэй, каб навучацца толькі на роднай беларускай мове, толькі ў сваіх настаўнікаў на чале з Уладзімерам Коласам, якія, як адзначылі бацькі, *«засьведчылі свае найвышэйшыя прафэсійныя і маральныя якасьці»*. ■

ПРЕСС-КОНФЕРЕНЦИЯ

Пища для размышлений

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

На пресс-конференции 17 июля белорусское представительство ООН начало кампанию по распространению на русском языке «Доклада о развитии человека за 2003 год».

Сейчас официоз гремит литаврами и в барабаны бьет по случаю 53 места Беларуси в индексе развития человеческого потенциала, ежегодно вычисляемого экспертами ООН. Если в прошлом году эта страна была на 56 месте в группе стран со средним уровнем развития человеческого потенциала, то теперь она с переместилась в группу высокого уровня.

Пусть Беларусь в списке стран с высоким уровнем развития человека занимает малопочетное третье снизу место. Ниже располагаются только Тринидад и Тобаго с Мексикой. Но для присяжных пропагандистов это ничего.

Они едва ли обратят внимание на прозвучавшее на пресс-конференции предостережение Пола Буне, главы белорусского представительства ООН, о том, что оононовские цифры суть не более, чем пища для размышления. Эта статистика позволяет сравнить достижения разных стран по целому ряду показателей, а не только по усредненному индексу.

Скажем, валовой национальный продукт на душу белорусского населения составляет всего 1226 долларов США. Примерно столько же в Парагвае, а в Турции и Доминиканской Республике этот показатель чуть выше.

Зато по уровню роста цен, названного в докладе эвфемизмом *«среднегодовое отклонение индекса потребительских цен»*, Беларусь впереди планеты всей. Для нашей страны этот индекс за период оононовских наблюдений с 2000 года по конец 2001 составил 61,1 пункта. Хуже только в Зимбаве (76,7), Анголе (152,6) и в сотрясаемой гражданской войной Демократической Республике Конго (357,3). ■

ПО ПОВОДУ

Следующий...

➲ *Окончание. Начало на стр. 1*

Так первым лукашенковским премьером стал Михаил Чигирь, до того занимавший должность председателя «Агропромбанка». А ему в замы по социальным вопросам был определен Виктор Гончар. Оба они были весьма далеки от Вячеслава Кебича, основного конкурента Александра Лукашенко на президентских выборах, как и большая часть тогдашних соратников новоиспеченного белорусского президента.

В пору другого периода чиновного разброда и шатаний по случаю конституционного референдума 1996 года, президент Лукашенко бросился в крепкие объятия компартийной номенклатуры. Михаил Чигирь ушел в добровольную отставку, а главой правительства был назначен Сергей Линг, олицетворявший преемственность власти. И при Кебиче, и при Чигире он пребывал в должности заместителя председателя правительства. А еще раньше заправлял Госпланом БССР.

Вроде бы далеко не силу внутриполитической нестабильности через два с лишним года Сергей Линг был насильственно отставлен и заменен Владимиром Ермошиным. Но если учесть, что у нового премьера в пятой графе значилось «русский», то подобная кадровая перестановка представлялась вполне естественной.

Русский вопрос всегда являлся для белорусской политики ничуть не менее важным, чем аграрный. К тому же в те годы многие были убеждены, что Александр Лукашенко вынашивал замыслы превратиться каким-то чудом во всесоюзные наследники престарелого Бориса Ельцина. И поводов для внешнего и внутреннего беспокойства у белорусского президента было предостаточно.

Также неспокойные времена для Александра Лукашенко настали после *«элегантной победы»* на президентских выборах 2001 года. Он лучше всех знал, какой ценой она была достигнута и чем он обязан чиновничеству. Гарантией президентской суверенности стали увольнения много возомнивших о себе бюрократов. В опалу попал казавшийся незаменимым глава президентской администрации Михаил Мясникович, и за компанию с ним был уволен Владимир Ермошин. А премьером стал покорно безликий Геннадий Новицкий.

Теперь пришла пора, когда прогнали со двора безответного Новицкого. Будь Александр Лукашенко, как скала, тверд и решителен, то держал бы его и властную вертикаль под дамокловым мечом увольнения вплоть до успешного проведения референдума. Тем более, слухи о предстоящих бюрократических пертурбациях упорно циркулировали весь июнь.

В предвыборной ситуации следовало бы ограничиться отрешением от должности двух-трех чиновников не самого значительного ранга. Скажем, снять пару губернаторов, с которыми у него расхождения по аграрному вопросу. Но логика избирательных технологий неуместна, когда на кону стоит ставка пожизненного президентства. Приходится понапрасну паниковать, отчаянно нервничать и бессмысленно суетиться. ■

НАРЫСЫ ЖЫЦЬЦЯ

Горад кантрастаў

ЗЬМІЦЕР СЕРАБРАКОЎ

Як у Пятрова зь Ільфам, усім хацелася ў Бабруйск хоць зараз. Бабруйск лічыўся высокакультурным месцам.

З чыстымі шыямі, як тыя дурні

Ад урадавых перастановак больш за ўсіх пацярпелымі аказаліся бабруйскія дворнікі, якія мусілі напярэдадні прыезду дэлегацыі на чале з прэм'ерам Навіцкім самым грунтоўным чынам чысьціць вуліцы гораду. Менавіта да візыту высокай урадавай дэлегацыі ў горад быў падрыхтаваны артыкул у «Аргумэнтах і фактах», дзе перад чытачамі разгортвалася панарама жыцьця буйнейшага з райцэнтраў рэспублікі. Новы мэр Бандарэнка атрымаў ужо славу мэцэната дробнага бізнэсу – у горадзе адчыняюцца новыя крамы і аўтасалён у будынку Тэатра драмы і камэдыі імя Дуніна-Марцінкевіча. Дарэчы, гэткія монстры – не выключэньне ў архітэктуры гораду: побач з тэатрам-аўтасалёнам знаходзіцца будынак Мікольскай царквы напалам з басэйнам, ёсьць і касьцёл з прыбудаваным да яго офісам будаўнічага трэсту.

У горадзе кантрастаў побач з элітнымі дамамі з кватэрамі па 30 000 даляраў знаходзяцца кварталы, дзе жывуць людзі малазабясьпечаныя. Большасьць працоўных дзяржпрадпрыемстваў атрымліваюць зарплату са спазьненьнем, напрыклад ФанДОК выплаціў толькі ў чэрвені зарплату за сакавік, на іншых прадпрыемствах і таго няма. Супрацоўнікі домакіраўніцтваў, якія атрымліваюць накіраваньне ў месцах па працаўладкаваньню і фактычна за ўмоўныя 70 000 рублёў займаюцца аздабленьнем фасаду гораду, абурана чакаюць візыту новай урадавай дэлегацыі.

Галота на вынаходніцтвы спрытная

Разам з маркетамі і шопамі ў горадзе суіснуюць і квітнеюць алькагольныя кропкі, якія, як здавалася, зусім зьніклі пасьля адмены сухога закону. За 1 200 рублёў можна набыць бутэльку самапальнай гарэлкі са сьпірту, выробленага на мясцовым гідролізным заводзе, для асабліва спрагнелых дзяржаўная бармэтуха прадаецца на разьліў і ў крэдыт па запісу. Палярызацыя масаў адбываецца па законах дзікага капіталізму, апісанага яшчэ клясыкамі марксызму.

Куды ідуць сродкі

Будоўля сталічнага супэрвакзалу і хваля манумэнтальнай гістэрыі ў правінцыі таксама атрымала адпаведны рэзананс: у Бабруйску плянуецца перабудова пасьляваеннага вакзальнага будынку ў увасабленьне чацьвёртага сну Веры Паўлаўны, на вуліцах гораду ідуць будаўнічыя работы па брукаваньні вуліц і ўсталяваньні бардзюрных камянёў.

Такое можна назіраць па ўсёй рэспубліцы, так рэстаўруюць, а хутчэй муміфікуюць, старое, каб прадаць за новае, як той цыган, які хоча з найбольшай выгадай здаць зьнямоглую клячу. Толькі каму? ■

СУСТРЭЧЫ Ў РЭДАКЦЫІ

«Я спакойна мог глядзець любому ў вочы»

Окончание. Начало на стр. 1

– Для вас гэта страчаны час?

– Я прасіўся сысці з ЦК тры разы. Гэтыя заявы сакратар па ідэалогіі Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін рваў і выкідаў у сметніцу. І ўсё ж я вырваўся, калі адбылася перабудова, у канцы 1986 года. Мікалай Нікітавіч Слюнькоў на адной сустрэчы, а потым і на другой угаворваў мяне: «Ну што гэта вы на такую пасадзу ідзеце? Тут вам будзе месца міністра культуры або старшыні камітэта па друку. Вось туды пойдзеце, на годную пасаду». А я: «Мікалай Нікітавіч, адпусціце Хрыста радзі. Гэта самае лепшае, што вы можаце зрабіць для мяне за маю амаль дзевяцігадовую працу ў ЦК». Таму, калі мяне накіравалі на работу галоўным рэдактарам часопіса «Полымя», я быў вельмі шчаслівы.

Але я не шкадую аб тым часе. Я меў магчымасць знаёміцца з літаратурай, якую я ніколі не прачытаў бы, калі б быў, як раней, карэспандэнтам газеты «Звязда». Бо многа літаратуры, што хацелася пачытаць, было засакрэчана ў сховах КДБ і ў іншых архівах. Таму шмат твораў і выданняў я прачытаў менавіта адтуль.

У ЦК я з вялікім задавальненнем працаваў над дзвюма праграмамі. Першая – выпуск мастацкай літаратуры і яе прапаганда праз кнігагандлёвую сетку і бібліятэкі. Другая – адукацыйная. Разам з аддзелам навукі наш аддзел культуры распрацоўваў праграму карэннага змянення ўсёй сістэмы адукацыі ў рэспубліцы – вышэйшай школы, сярэдняй, сярэдне-тэхнічнай і агульнаадукацыйнай. Найперш, у плане нацыяналізацыі, а па-другое – надання сістэме адукацыі больш высокага інтэлектуальнага ўзроўню. На жаль, гэта праграма засталася пад сукном. Яе не прынялі, таму што ў Маскве палічылі нацыяналістычнай. Хаця там ніякіх рэвалюцый закладзена не было, а прадугледжвалася паэтапна перавесці адукацыю на нацыянальныя рэйкі.

– Ці даводзілася ўступаць у канфлікты?

– Канешне, ворагі ў мяне былі. Таму што заўсёды там, дзе была графаманія, дзе чалавек, не маючы здольнасцяў, таленту, пнуўся сябе сцвердзіць метадам лакейства, я гэтага не прымаў і не прымаю. Наогул, чынашанаванне – наша страшнейшая хвароба. Любы мужычонка, п'яніца горкі, які валяецца пад плотам, калі толькі яго паставяць брыгадзірам, то людзі забываюцца на ягоныя якасці. Бо ён – начальнік. І людзі яго слухаюцца, і як робаты выконваюць яго дурныя загады. Мы гэта назіраем сёння знізу даверху.

Давялося займацца многа чым, і шчаслівы, што з «Высокага дому», як называлі ў той час ЦК, мне было лёгка вяртацца ў жывое пісьменніцкае асяроддзе, бо я спакойна мог глядзець любому ў вочы.



– Ваш дзядзька, вядомы паэт Сяргей Ракіта, быў рэпрэсаваны ў 30-я гады. Як склаўся яго лёс?

– Мой дзядзька, Сяргей Васільевіч Законнікаў (Сяргей Ракіта – яго літаратурны псеўданім), у 30-я гады быў арыштаваны ў 26 гадоў, асуджаны сталінскім судом і згінуў ў лагерах. Нават не ведаем, дзе ягоная магіла. Адзінае вядома, што апошняе яго месца заключэння – станцыя Сухабязводная Горкаўскай вобласці (сёння Ніжагародская вобласць). На тым месцы, дзе быў сталінскі лагер, вырас сасновы лес, дзенідзе засталіся рэшткі баракаў, зусім спарахнелыя, і дрот калючы. Можа, ён там і загінуў.

– Шмат хто за савецкім часам пісаў творы ў стол. А беларускія пісьменнікі стваралі пратэстную літаратуру ці былі талерантныя да ўладаў?

– У параўнанні з пісьменнікамі Расіі, Украіны, канешне ж, на Беларусі было менш тых, хто ў пасляваенныя гады пісалі ў стол. У асноўным гэта былі працы, звязаныя з успамінамі. Успамінаў і дзённікаў было многа. Што тычыцца мастацкіх твораў – раманаў, аповесцяў, паэмаў – такой практыкі не было. Сярод недрукаваных твораў былі некаторыя вершы. Але масавага пісання ў стол, як на Украіне і ў Расіі, не было.

Калі браць 20–30-я гады, то, вядома, Беларусь мае самы унікальны прыклад, як выпрацоўвалася тэхналогія вынішчэння інтэлектуальнага патэнцыялу нацыі. Трэба аддаць належнае нашым пісьменнікам, таму што калі б не беларуская літаратура, то на сённяшні дзень сітуацыя з нацыяфармаваннем была б яшчэ горшая. У першую чаргу трэба дзякаваць пісьменнікам, а потым навукоўцам, святарам, ваенным і іншым людзям, якія сталі за ідэю незалежнасці і дзяржаўнасці Беларусі.

Гаварыць пра тое, як некаторыя, што наша літаратура не ўяўляе вялікага значэння, нельга. Яна не лепшая, але і не горшая за любую еўрапейскую літаратуру. Іншая справа, што ў кожнай літаратуры ёсць свае асаблівасці. Наша літаратура занадта традыцыйная, засяроджаная на ваеннай тэме, калектывізацыі, вёсцы. Гэта не значыць, што не было выдатных твораў. Калі мы возьмем «Знак бяды» Быкава – там і пра вайну, і пра калектывізацыю, але твор выходзіць і на агульначалавечыя маштабы, уздымае высокафіласофскія праблемы – захавання чалавечага ў чалавеку.

Не трэба спісваць і Івана Мележа з рахунку. Ягоныя «Людзі на балоце» – выдатны твор, які на сваім этапе зрабіў вельмі многае, каб абудзіць новае пакаленне пісьменнікаў. Паглядзіце, колькі за Мележам прыйшло – і Віктар Казько, і Анатоль Кудравец, і Віктар Карамазаў, і Алесь Жук, і Генрых Далідовіч, і Вольга Іпатава. У нас паявілася вельмі многа празаікаў, якія былі ўжо не проста вясковыя або ваенныя. Яны выйшлі на больш сучасны, агульначалавечы ўзровень.

–А зараз беларускія пісьменнікі, якія не займаюцца лакействам, таксама, як і ў савецкія часы, пішуць у стол? Ці маюць магчымасць выдавацца?

– Ідзе павальнае пісанне ў стол. Няма дзе друкавацца. Зараз дзесяткі кніг ляжаць у сталах пісьменнікаў. І гэта пытанне не толькі фінансавае, але і ідэалагічнае.

Ганарары нават у параўнанні з 90-м годам зменшыліся ў 9–17 разоў. Пісьменнікі сёння з'яўляюцца адной з самых неабароненых катэгорый насельніцтва ў духоўнай сферы. Яны аказаліся ў вельмі цяжкім матэрыяльным становішчы.

– Над чым вы працуеце зараз?

– У стол я пішу ў асноўным вершы. Напісана кніжка эсэ, кніжка літаратурных партрэтаў сяброў, паплечнікаў. Ляжыць ў мяне кніга паэмаў «Прадонне» з прадмовай Васіля Быкава. Некаторыя з іх друкаваліся, іншыя не так шырока вядомыя. Гэты зборнік абяцалі выпусціць яшчэ ў 1996 годзе, але ён так і не выйшаў. А не ў стол пішу публіцыстычныя роздумы пра тое, што адбываецца ў свеце.

– Як складваюцца справы з выданнем часопіса «Дзеяслоў»?

– Ідзе сабатаж. Не бяруць у падпісны каталог, у дзяржаўныя кіёскі. Хаця пры цвярозым розуме ў гэтай сітуацыі дзяржава, наадварот, павінна была б быць зацікаўлена ў выхадзе новых часопісаў. Бо выдаўцы не патрабуюць ні адной дзяржаўнай капейкі, а, наадварот, будуць плаціць дзяржаве падаткі. У той жа Польшчы літаратурна-культуралагічных часопісаў такога плану каля 300. У Літве – 100. І там дзяржава падтрымлівае іх. Мы пра такое і не марым нават. Але ўлады цвёрда паставілі бар'ер, каб не было новых літаратурных выданняў. Занята пазіцыя, каб знішчыць усё, каб была пустыня, дзе ніякага жывога слова, якое будзіць думку.

Чаго баіцца ўлада? Літаратурныя выданні – свабодалюбівыя. Яны не могуць быць у клетцы. Так ці інакш яны выходзяць на праблемы, якія не падабаюцца ўладзе.

(працяг будзе)

БЕЛОРУССКИЙ ПУТЬ

Железный занавес

ЛЮДМИЛА ПАШКОВСКАЯ

7 августа офис представительства американской общественной организации *IREX ProMedia* в Беларуси должен быть закрыт. Представительству отказано в перерегистрации, как и другим иностранным организациям, вошедшим в пресловутый список Совмина.

Когда белорусский МИД республики отказался продлить аккредитацию американскому Совету по международным исследованиям и обменам (*IREX*), на память пришли события уже прошедшей несколько лет назад другой информационной войны. В результате ее было закрыто представительство в Беларуси фонда Сороса.

Кто выиграл от того, что фонд был закрыт? Во всяком случае, не библиотеки, школы и вузы, которым оказывалась постоянная материальная помощь.

Хочется напомнить, что некоторые книги, например, по теории журналистики, выпущенные фондом, до сих пор являются основными учебниками для преподавателей факультета журналистики БГУ. А стажировки и образовательные поездки представителей разных сфер культуры и науки за рубеж принесли немало пользы в их дальнейшей профессиональной деятельности в Беларуси. Теперь деньги фонда Сороса идут к нашим соседям – украинцам и россиянам.

Кто выиграет от закрытия *IREX*? Во всяком случае, не студенты и пресса. Они лишаются многих реальных возможностей для контактов и взаимного сотрудничества с зарубежными коллегами.

Как известно, поводом для отказа в дальнейшей аккредитации и для требования закрыть офис компании стали некие нарушения белорусского законодательства, выявленные Комитетом государственного контроля в процессе проверок представительства. Был еще идеологический донос по БТ в виде документального фильма «*Павуцiнне*». Все это и вызвало исключение *IREX ProMedia* из перечня программ помощи США, одобренных белорусским правительством. К сожалению, в этой стране если что-то высочайше не утверждено, то оно сразу становится запретным.

IREX имеет сегодня представительства в 22 странах и 50 городах Америки, Европы, в странах бывшего СССР, на Ближнем Востоке и в Азии. Со дня своего основания в 1968 году *IREX* оказал поддержку более 15 тысячам студентов, ученых, общественных деятелей, предпринимателей, журналистов из 34 стран мира.

Для Беларуси *IREX* стал неотъемлемой частью свободного получения информации. Для государственных и независимых СМИ *IREX* – это бесплатный фотоархив с цифровыми изображениями, охватывающими чуть ли не все сферы жизни Беларуси. *IREX* предоставлял бесплатно провайдерские услуги по доступу в интернет. Безо всякой оплаты на сервере *IREX* могли размещать свои веб-странички газеты и журналы страны. Бесплатным интернетом также пользовались областные библиотеки.

Не стоит забывать и о регулярных бесплатных семинарах и стажировках в США специалистов. При этом процент государственных служащих, которые побывали за это время в США, не меньше, чем представителей неправительственных организаций. Годичная учеба в вузах США предлагалась и студентам государственных вузов.

IREX немало поработал и на государственную прессу. Его архивом, функционировавшим с 1997 года, пользовались «Советская Белоруссия», «Знамя юности», «Республика», «Семь дней», «Вечерний Минск», «Во славу Родины», «Звязда», «Народная газета». Они же размещали в архиве свои публикации.

Каждый день в офисе *IREX* можно было увидеть массу государственных журналистов, часами висевших в интернете. Некоторые искали информацию, но большинство на халяву отправляли свои имэйлы и болтали в чатах.



Другие зарубежные благотворительные организации, обосновавшиеся в нашей стране, в любой момент могут потерять твердую опору. Ведь в «паутину» поддержки, созданную иностранными филантропами, в первую очередь попадают финансируемые в Беларуси по остаточному принципу образование, культура, здравоохранение.

Так, после приезда в Институт Гете Интер Национес в Минске нового директора по некоторым организациям, с которыми институт тесно сотрудничал, прошли соответствующие проверки. Как всегда, искали следы денежного или политического криминала. Но ведь Институт Гете проводит исключительно культурные или языковые программы.

Не столь уж прочно положение и Минского международного образовательного центра (*IBB Minsk*), под крышей которого частенько собираются представители оппозиционных структур. Скоро из Беларуси будет изгнана благотворительная американская организация *Internews Network*, которая помогала независимым региональным телекомпаниям Беларуси. После ликвидации белорусского офиса *IREX* ей тоже будет отказано в дальнейшей регистрации. ■

ПОСТСОВЕТСКИЕ НОВОСТИ

Россия. Советник президента России по экономическим вопросам Андрей Илларионов выразил недоумение происходящим с нефтяной компанией «ЮКОС». По его словам, *«довольно трудно избежать ощущения избирательности»* действий государства в отношении ряда субъектов хозяйствования. В частности, у коммерц-советника Илларионова возник вопрос, почему генпрокурор Устинов занимается делом «ЮКОСа» 10-летней давности и ничего не предпринимает в отношении компании РАО «ЕЭС России», возглавляемой Анатолием Чубайсом, столь нелюбимым президентским советником.

Азербайджан. Партия социального благоденствия создала в Баку предвыборный центр президентского сына Ильхама Алиева, о чем поведал 15 июня журналистам председатель этой проправительственной организации Хангусейн Кязымлы. *«Центр уже начал работу по пропаганде кандидатуры Ильхама Алиева в регионах страны»*, – сообщил он на пресс-конференции. Кязымлы опроверг информацию о том, что ПСБ поддерживает Алиева-младшего только лишь как сына президента: *«Ильхам сам по себе является выдающейся личностью, завоевавшей авторитет во всем мире. В политике Гейдара и Ильхама Алиевых нет принципиальных расхождений. У них единый курс»*. После такого заявления независимые наблюдатели не исключают, что в нужный момент оба Алиевых могут свободно переуступить голоса своих избирателей один другому.

Грузия. Спикер грузинского парламента Грузии Бурджанадзе ведет консультации с представителями ряда оппозиционных партий с целью создания единого предвыборного блока. *«Политики должны объединиться против таких зол, как синдром ненаказуемости, который проявляется хотя бы в том, что за хроническое невыполнение бюджета страны никто не несет ответственности за коррупцию, совершенно непонятное чрезмерное обогащение определенной группы людей за счет государства»*. Далее спикер Бурджанадзе заявила, что в стране должны произойти *«революционные преобразования без революции»*. Она также полагает, что новое руководство Грузии, которое придет к власти после парламентских и президентских выборов, обязано совершить *«непопулярные шаги для вывода страны из кризиса»*, для чего ему необходимо заручиться *«полной поддержкой народа»*.

Украина. Леонид Кучма поручил изучить правовые аспекты отзыва своего законопроекта об изменениях в основной закон страны из конституционного суда. *«Внутренне, для себя, я решение принял. Считаю, что это будет по-мужски, не только по-президентски. Я отзываю свой проект не потому, что мне хочется это делать, а потому, что не хочу загонять проблему в глухой угол»*, – сказал президент Кучма 15 июля на пресс-конференции в Киеве. Также глава украинского государства отметил: *«Пусть парламент, если ему нравится его проект, работает»*. Вместе с тем он подчеркнул, что депутатский законопроект – *«это не проект парламента, это проект нескольких политических сил в парламенте»*. Напомним, что в конституционный суд уже поступили президентский и парламентский законопроекты о внесении изменений в конституцию. Значительная часть депутатского корпуса скептически воспринимает предложения главы государства о проведении всех выборов стране в один год, о перечне условий роспуска Верховной рады, о порядке назначения ряда министров и руководителей силовых структур.



Россия – Украина. Во времена СССР марионеточные республики потребляли импортное канадское и американское зерно. Теперь все несколько иначе, и Россия готова обеспечить поставки своего зерна на Украину, испытывающую его недостаток в связи с неблагоприятными погодными условиями. Об этом заявил вице-премьер правительства РФ Алексей Гордеев. *«Украина заинтересована в приобретении российского зерна»*, – отметил российский вице-премьер. На прошлой неделе Верховная рада Украины приняла решение ввести льготный режим пошлин на импорт зерна до 1 ноября в связи с неблагоприятными погодными условиями и ожидаемым плохим урожаем. Министр Гордеев также отметил, что прогноз российского урожая зерна в этом году не изменился и, как ожидается, составит 70 миллионов тонн.

Молдавия. Возможно, в недалеком будущем Молдавии придется импортировать шампанское. Своего не останется, так как на своем недавнем заседании молдавский парламент, контролируемый коммунистами, объявил известный Криковский комбинат шампанских вин *«национальным достоянием»*, из-за чего это предприятие не может быть приватизировано и лишится инвестиций для модернизации производства. Предприятие *Cricova* было создано в середине XX века в каменных галереях неподалеку от местечка Криково. Комбинат и хранилище коллекционных вин расположены в штольнях на глубине 80–90 метров и имеют общую протяженность более 64 километров. Винотека *Cricova* содержит 700 тысяч бутылок: в том числе вина из Франции, Португалии, Испании, Италии из урожая послевоенных лет, часть знаменитой коллекции нацистского бонзы Геринга, вина более чем 50-летней выдержки из 11 бывших советских республик и последнюю в мире бутылку Иерусалимского вина 1902 года.

